УДК 821.161.3.09

**Борбат Таццяна Іванаўна**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова
(г. Магілёў, Беларусь)
borbat_ti@msu.by

# АПАВЯДАННІ АЛЕСЯ ЯКІМОВІЧА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ: ІДЭЙНА-МАСТАЦКІЯ АДМЕТНАСЦІ

У артыкуле аналізуюцца апавяданні А. Якімовіча для дзяцей, акрэсліваецца іх праблемна-тэматычнае кола і вызначаюцца ідэйна-матацкія адметнасці, таксама адзначаюцца асаблівасці іх ацэнак у сучасным літаратуразнаўстве.

***Ключавыя словы:*** апавяданне, ідэйна-мастацкі змест, праблемнае кола, маральна-этычныя праблемы, патрыятычны пафас, псіхалагізм, паэтызацыя, традыцыі

The article analyzes A.Yakimovich's stories for children, identifies its problem-thematic levels. Ideological artistic features are highlighted in the article as well as peculiarities of evaluating the stories in the modern literary criticism.

***Keywords:*** story, ideological art content, problem field, ethical issues, patriotic pathos, psychology, poetry, traditions

Алесь Якімовіч – адзін з пачынальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры, узбагаціў яе разнастайнымі па жанрах і тэматыцы творамі: вершаванымі і празаічнымі казкамі, апавяданнямі і аповесцямі.

Асабліва важкі ўнёсак пісьменніка ў развіццё беларускай дзіцячай прозы, галоўным чынам такога яе жанру, як апавяданне, пра што сведчаць кнігі “Гул бубна” (1925), “Залаты зуб” (1937), “Помста” (1946), “Сябры” (1952), “Залатыя рукі” (1975). Лепшыя апавяданні з гэтых зборнікаў па-ранейшаму не страцілі сваіх мастацкіх якасцяў і пазнавальнасці. Героямі большасці твораў з’яўляюцца дзеці, равеснікі чытачоў, якім пісьменнік дапамагае асэнсаваць важнейшыя падзеі, што адбываліся ў краіне ў розныя гістарычныя перыяды (“Сірата”, “Беспрытульны”, “Новы год”, “Юзік”). А. Якімовіч паказвае нялёгкае жыццё дзяцей у Заходняй Беларусі, іх прагу да ведаў, псіхалагічныя перажыванні бацькоў, якія клапоцяцца, каб дзеці “выйшлі ў людзі” (“Апоркі”). Многія апавяданні прысвечаны паказу гаротнай долі парабкаў, сірот, беспрытульных (“Сірата”, “Беспрытульны”, “Апоркі”). Трэба адзначыць, што апавяданні А. Якімовіча на тэму абяздоленага дзяцінства блізкія сваім драматызмам да твораў З. Бядулі (“Малыя дрывасекі”, “Велікодныя яйкі”, “Пяць лыжак заціркі”, “Тулягі”).

Так, не могуць не хваляваць малога чытача пакуты Марылькі – галоўнай гераіні апавядання “Сірата”, якая служыць парабчанкай у сквапнай гаспадыні Антолі. Кожны дзень дзяўчынка чуе папрокі, лаянку, праклёны. Антоля нават прымушае Марыльку красці ў суседзяў палотны, дровы; дзяўчынка пачынае разумець, што гаспадыня *“выхоўвала з яе такую ж Антолю – прагную, сквапную”* [4, с. 40]. Даведаўшыся аб намерах гаспадароў пакрасці



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ў саўгасе цыбулю, Марыля паведамляе аб гэтым яго дырэктару. З таго часу дзяўчына засталася жыць і працаваць у саўгасе, пайшла вучыцца ў мясцовую семігодку. Відавочна, што пісьменнік услаўляе саўгаснае жыццё, кантрасна супрацьпастаўляючы яго аднаасобнай вёсцы*: "тут зусім ўсё не так, як у іхняй вёсцы. Вялікія каменныя будыніны – аборы для жывёлы. Агароды з добры палетак. На двары машыны: касілкі, жняяркі, малатарні"* [4, с. 41].

Сіроцкая доля напаткала і Максімку – героя апавядання "Беспрытульны". Пасля смерці маці гаспадар выгнаў яго з кватэры і хлопчык апынуўся на вуліцы; галодны блукае па горадзе, і людзям няма ніякай справы да яго пакутаў і няшчасцяў: "<…> *Усе кудысьці ідуць – адны спяшаюцца, другія так сабе шпацыруюць. Ніхто, здаецца, і не гляне на гэту маленькую мурашку – беднага худзенькага хлопчыка Максімку"* [4, с. 31]. Пасля сустрэчы з піянерам "*новая, светлая дарога малявалася перад вачыма*": *"ён будзе вучыцца і жыць у дзіцячым доме"* [4, с. 34 ]. Гул бубна нагадвае дзеду Цімоху і яго суседу Ігнасю пра піянераў (унука Васька і яго сяброў), якія ідуць *"у новы, незразумелы свет радасці і шчасця"* (апавяданне "Гул бубна") [4, с. 30]. Старыя, жартуючы, нават задумваюць падацца ў піянеры.

Відавочна, для некаторых апавяданняў гэтага часу ўласцівыя схематызм канфліктаў і спрошчанасць сітуацый і характараў. Пісьменнік прытрымліваўся распаўсюджанай схемы – рэзкага падзелу герояў на станоўчых і адмоўных, спрацоўваў тэматычны стэрэатып. Зразумець творчасць пісьменніка 1920–30-х гг. можна, толькі паставіўшы яе ў кантэкст развіцця тагачаснай літаратуры, яе клопатаў і задач. Канфлікты ў творах А. Якімовіча былі ў многім характэрныя для літаратуры гэтага перыяду, якая ўздымала вострыя сацыяльныя пытанні і менш цікавілася маральна-этычнымі праблемамі.

Тым не менш адточвалася майстэрства, выпрацоўваўся індывідуальны аўтарскі стыль. Асноўным творчым прыёмам А. Якімовіча, на думку І. Разанава, "з'яўляецца імкненне паставіць героя ў больш ці менш складаныя абставіны, што дае магчымасць глыбей раскрыць рысы характара персанажа, паказаць яго ўнутраны свет" [3, с. 4].

Творчасць А. Якімовіча пасляваеннага часу таксама вызначаецца грамадзянскай накіраванасцю, асабліва гэта датычыцца апавяданняў на тэму Вялікай Айчыннай вайны ("Чарнавочка", "Аўтамат", "Светлы дзень", "Брат і сястра", "Партызанская маці", "У родным горадзе", "Аладкі" і інш.), якія вызначаюцца больш паглыбленым прачытаннем аўтарам жыццёвага матэрыялу, больш дакладным яго асэнсаваннем. А. Якімовіч паказвае, што на акупаванай тэрыторыі ў змаганне з ворагам актыўна ўключыліся не толькі дарослыя, але і падлеткі, дзеці: яны станавіліся партызанскімі разведчыкамі, сувязнымі. Адзначым, што тэма "вайна і дзеці" была балючай для А. Якімовіча: на руках жонкі пісьменніка ў час бамбёжкі загінуў ад асколкаў снарада нованароджаны сын. За дапамогу партызанам фашысты расстралялі бацьку пісьменніка, ледзь не згарэла ў падпаленай акупантамі хаце маці, яна памерла крыху пазней, так і не дачакаўшыся перамогі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Так, партызанкай-сувязной стала дзяўчынка Валя, якая да вайны скончыла толькі чатыры класы (апавяданне “Чарнавочка”). Па даносе здрадніка дзяўчына апынулася ў гестапа, загінула, але нічога не сказала ворагам. Падлеткі Віця і Грышка, героі апавядання “Аўтамат”, марацць аб змаганні з ворагам, далучыцца да партызан і перадаць ім схаваны ў клеці аўтамат. Аднак аўтамат неўзабаве спатрэбіўся ім самім. Калі Грышка даведаўся аб тым, што фашысты збіраюцца павесіць Віцю і яго маці, то спачатку разгубіўся, *“зашыўся ў цёмны куток клеці і плакаў наўзрыд, несціхана. Ён жа таксама еў праклятыя нямецкія цукеркі”, якімі яго пачаставаў Віця* [4, с. 98]. Слёзы градам каціліся з вачэй. *“Я буду страляць”*, – вырашыў хлопец [4, с. 100]. Пасля таго, як усё скончылася, хлопцы накіраваліся да партызан.

А. Якімовіча таксам цікавяць маральна-этычныя праблемы, звязаныя з выхаваннем дзяцей. Апавяданні “Васількі”, “Слабая воля”, “Навічок”, “Як Віця заблудзіўся”, “Цяжкая хвароба” вызначаюцца сюжэтнай разнастайнасцю, жыццёвасцю адлюстраваных сітуацый, дынамічнасцю, індывідуалізацыяй мовы персанажаў. Гэтыя і многія іншыя творы вучаць дзіцяці працавітасці, сумленнасці, дружбе, павазе да старэйшых.

Пісьменік умеў гаварыць з дзецьмі “на роўных” – “без празмерных павучанняў і маралізатарства, як добры старэйшы таварыш, які больш за іх бачыў на жыццёвай дарозе і якому ёсць пра што расказаць” [2, с. 130].

Напрыклад, падумаць, паразважаць чытача над ўчынкамі і паводзінамі герояў пісьменнік заклікае ў апавяданні “Слабая воля”. Вучань чацвёртага класа Міша двойку па арыфметыцы тлумачыць тым, што ў яго не хапае настойлівасці. На самой жа справе воля ў яго моцная: ён спакусіў добрага вучня Толю *“сваім фільмаскопам і канькамі і за два дні адвучыў яго ад арыфметыкі”* [4, с. 252]. У апавяданні “Цяжкая хвароба” з гумарам выпісаны вобраз гультая і хітруна Віці Бегунка, якога *“сілаю трэба падымаць з пасцелі, сілаю прымушаць рабіць урокі, складваць у партфель кнігі і сшыткі”* [4, с. 254]. Хлопчык ведае, як маці яго любіць і клапоціцца аб здароўі, і каб не ісці ў школу, скардзіцца на які-небудзь боль.

Добрае веданне пісьменнікам псіхалогіі дзіцяці выяўляецца ў апавяданнях “Залатыя рукі”, “Першы працадзень”, “Маніна градка”, прысвечаных тэме працы. Пры гэтым нельга не пагадзіцца з М. Барсток, якая слушна адзначыла, што некаторыя апавяданні А. Якімовіча, асабліва на тэму школьнага жыцця (“Навічок”, “Сакрэт”, “Авіятары”), сапсаваны “адкрытым дыдактызмам і схематызмам, што адмоўна ўплывае на мастацкую вартасць твораў” [1, с. 222].

Праца паказана як важнейшы фактар выхавання і перавыхавання дзяцей. А. Якімовіч паэтызуе працу, паказвае, што яна прыносіць героям задавальненне і асалоду. Так, дзяўчаты-цімураўцы Галя і Вера шчыра дапамагаюць па гаспадарцы дзядулі-ветэрану (апавяданне “Залатыя рукі”). Яны сталі *“для яго не толькі памочніцамі, але і жаданымі гасцямі”* [4, с. 164]. Дзяўчаты здолелі нават пашыць старому ветэрану новую кашулю да прыезду сына. Радасць і хваляванне перапаўняюць сэрца падлетка Міхася (апавяданне “Першы працадзень”), якому



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

брыгадзір даручыў "сапраўдную мужчынскую работу" – абганяць бульбу. *"Ого, гэта ж такая работа, якой пазайздросціць не адзін яго дружка. Гэта не тое што свірэпка <...>. Самая што ні на ёсць работа – з плужком-абганянкай, з жывым канём, з пугай..., "* – з гонарам думае хлопец [4, с. 225–226]. Аўтар вельмі дакладна перадае ўнутраны стан героя, яго нецярплівае жаданне хутчэй распачаць працу. Міхасю прыемна было атрымаць працоўную кніжку, *"якую паднёс яму брыгадзір і ў якой на першай старонцы красаваўся яго першы сапраўдны працоўны дзень"* – прызнанне значасці працы падлетка [4, с. 333]. Захапілася дзяўчынка Маня, гераіня апавядання "Маніна градка", ідэяй пасадзіць бульбу расадай. Яна настойліва ўзялася за справу: робіць скрынкі, саджае бульбу, затым перасаджвае парасткі, з любоўю іх даглядае, і як вынік – добры ўраджай бульбы. Нават старшыня калгаса пахваліў дзяўчынку.

Пісьменнік творча выкарыстоўваў традыцыі Я. Коласа і З. Бядулі – адсюль і паэтычнае бачанне свету, і тон даверлівай размовы з дзецьмі, і жыццёвасць адлюстраваных падзей і сітуацый, і глыбіня псіхалагічнага аналізу. Апавяданні А. Якімовіча, напісаныя са шчырай любоўю да дзяцей, маюць вялікае выхаваўчае значэнне і значна пашыраюць ідэйна-тэматычны дыяпазон "малой" дзіцячай прозы.

## Літаратура

1. Барсток, М. Алесь Якімовіч / М. Барсток // Беларуская дзіцячая літаратура : вучэб. дапаможнік / М. Б. Яфімава, М. М. Барсток, Э. С. Гурэвіч [і інш.] ; пад агул. рэд. М. Б. Яфімавай, М. М. Барсток. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : Вышэйшая школа, 1980. – 352 с.

2. Борбат, Т. І. Алесь Якімовіч / Т. І. Борбат // Беларуская дзіцячая літаратура : вучэб. дапаможнік / А. М. Макарэвіч [і інш.] ; пад агул. рэд. А. М. Макарэвіча. – Мінск : РІПА, 2016. – С. 226-138.

3. Разанаў, І. Шчодрае сэрца пісьменніка / І. Разанаў // Збор твораў : у 3 т. / А. Якімовіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1978. – Т. 1 : Аповесці. – С. 3–8.

4. Якімовіч, А. Збор твораў : у 3 т. / А. Якімовіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1980. – Т. 3 : Апавяданні, казкі, аўтабіяграфія. – 480 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова